**Дулаў А.М., Юрчак Д.В.**

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ: ЗМЕСТ, АСАБЛІВАСЦІ ЎЛІКУ І АХОВЫ

*Ключавыя словы:* гісторыка-культурная спадчына, гісторыка-культурныя каштоўнасці, асаблівасці аховы розных відаў гісторыка-культурных каштоўнасцяў, Віцебская вобласць.

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца важнай і неад'емнай часткай культурнай і гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Згодна з артыкулам 15 Канстытуцыі дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны. Гэты ж абавязак ужо артыкулам 54 Асноўнага Закону ўскладзены на ўсіх грамадзян рэспублікі і іншых асоб, якія пражываюць ці знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. Фактычна гэта адзін з канстытуцыйных абавязкаў, што толькі падкрэслівае значэнне гэтага накірунку работы.

У межах дадзенай публікацыі мы паспрабуем акрэсліць структуру гісторыка-культурнай спадчыны Віцебскай вобласці па стане на восень 2025 года, адлюстраваць асаблівасці ўліку і аховы розных відаў каштоўнасцей. Гэта ў сваю чаргу дасць магчымасць вызначыць праблемы, з якімі прыходзіцца сутыкацца ў працэсе аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў рэгіёне, а таксама вызначыць магчымасці іх вырашэння.

На сённяшні дзень на тэрыторыі Віцебскай вобласці знаходзіцца 997 асобных шыфравых гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці вобласці складаюцца з 372 помнікаў археалогіі, 323 помнікаў архітэктуры, 263 помнікаў гісторыі, шасці матэрыяльных рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцяў, пяці помнікаў мастацтва (адзін з якіх адначасова з'яўляецца матэрыяльнай рухомай гісторыка-культурнай каштоўнасцю), двух помнікаў горадабудаўніцтва і дзвюх запаветных мясцін. Таксама ў Віцебскай вобласці зараз маецца 25 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей [1].

Сярод матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорыю "0" маюць 3 аб'екты, катэгорыю "1" – 6, катэгорыю "2" – 107 і катэгорыю "3" – 856 каштоўнасцей. Адначасова варта адзначыць, што значная колькасць з аб'ектаў спадчыны з'яўляюцца комплекснымі і могуць адначасова ўключаць ў сабе некалькі, а ў асобных выпадках – нават дзясяткі каштоўнасцей без катэгорыі.

Асобна трэба спыніцца на асаблівасцях аховы розных відаў гісторыка-культурных каштоўнасцей. Найбольш складаныя праблемы ўзнікаюць з захаваннем і рэстаўрацыяй помнікаў архітэктуры, а таксама помнікаў горадабудаўніцтва, як комплексных каштоўнасцей, якія ўключаюць у сябе ў тым ліку шэраговую забудову.

На сённяшні дзень у вобласці 323 помнікі архітэктуры. Адразу варта адзначыць, што абсалютная большасць аб'ектаў гэтай групы знаходзяцца ў добрым стане, актыўна эксплуатуюцца і выкарыстоўваюцца ў тым ліку для прыцягнення турыстаў. Штогадова колькасць падобных аб'ектаў узрастае. Дастаткова прывесці прыклад г. Полацка, дзе за апошні час завершаны рэстаўрацыйныя работы на Доме афіцэраў, будынках, якія размешчаны на тэрыторыі Верхняга замка і прыстасаваны для размяшчэння Полацкага кадэцкага вучылішча. Прыгадаць той факт, што у 2024 годзе завершаны маштабныя работы па рэстаўрацыі адной з самых старажытных цэркваў Беларусі (Спаса-Праабражэнскай), якая захавала амаль на 90% аўтэнтычных фрэсак XII ст.

Але на фоне названых пазітыўных прыкладаў трэба помніць, што па стане на 2022 год у Віцебскай вобласці было 68 невыкарыстоўваемых гісторыка-культурных каштоўнасцей, частка з якіх захавалася на ўзроўні руін. І усе яны патрабавалі, а многія яшчэ патрабуюць рэстаўрацыі ці кансервацыі і ўцягнення ў гаспадарчую ці

турыстычную дзейнасць. З гэтай мэтай па даручэнні ўрада быў распрацаваны абласны план на 2022–2025 гг. па захаванні аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Віцебскай вобласці з пакрокавымі дзеяннямі, па кожным аб’екце гісторыка-культурнай спадчыны, які не выкарыстоўваецца і знаходзіцца ў нездавальняючым стане.

Дзякуючы гэтаму плану і дзейнасці ўласнікаў былі завершаны работы на дзесяці раней невыкарыстоўваемых будынках, у тым ліку на Былым доме афіцэраў, трох будынках на тэрыторыі Верхняга замка, будынку былой гасцініцы ”Гранд-атэль“ у Полацку, будынках па адрасах г. Віцебск, вул. Будзённага, 7, вул. Камісара Крылова, 4, вул. Калініна, 20, вул. Энгельса, 8; аднаўлена Вялікая Любавіцкая сінагога, гістарычна звязаная з сям’ёй Марка Шагала.

Акрамя таго, за час рэалізацыі плана з аўкцыёну рэалізавана сем аб’ектаў спадчыны, на двух з якіх амаль завершана рэстаўрацыя, на астатніх працягваюцца работы. Паказальным з’яўляецца прыклад прыватнага інвестара, які набыў былы завод ”ВітВін“ (Пакроўская, 7), дэмантаваў негістарычную забудову і праводзіць работы па аднаўленні трох гістарычных будынкаў з узвядзеннем новых аб’ектаў на тэрыторыі былой прамысловай зоны, выкананых ў стылістыцы канца XIX ст. У выніку так званы Шагалаўскі квартал, які раней існаваў выключна на паперы, паступова набывае свае абрысы.

Ёсць у Віцебскай вобласці і прыклад рэалізацыі інвестыцыйнага праекта на гісторыка-культурных каштоўнасцях. Гэта так званы “Дом ста акон” – сядзіба Станіслава Гласка ў цэнтры Расон. Прыватны ўласнік заключыў інвестыцыйны дагавор і вядзе аднаўленне прыгожага будынка ў райцэнтры. Пры заканчэнні работ плануецца, што ў будынку размесціцца гасцініца і іншыя ўстановы, скіраваныя на турыстаў і падарожнікаў.

З пералічаных невыкарыстоўваемых аб’ектаў на дзевяці на дадзены момант праводзяцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы, яшчэ на чатырох завяршаецца праектаванне ці праект ужо знаходзіцца на стадыі ўзгаднення. У тым ліку на такіх знакавых аб’ектах як палац губернатара ў Віцебску, былы кляштар францысканцаў ў Полацку, на базе якіх павінны з’явіцца новыя запатрабаваныя сярод турыстаў музейныя ўстановы.

Некаторыя аб’екты толькі падрыхтаваны да рэалізацыі і пажадана каб гэты пералік павялічваўся. Але не ўсе ўласнікі з-за сваіх фінансавых магчымасцяў здольныя падрыхтаваць аб’екты да аўкцыёну, у першую чаргу гэта датычыцца сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

На вялікі жаль, ёсць у Віцебскай вобласці і праблемныя ўласнікі. На дадзены момант тры гісторыка-культурныя каштоўнасці знаходзяцца пад арыштам з-за фінансавых праблем іх гаспадароў. Аршанскім райвыканкамам распачаты працэс па ануляванні дагавору па куплі былога сядзібнага дома Макшыцкіх у п. Высокае з-за невыканання ўласнікам умоў дагавору па рэстаўрацыі помніка архітэктуры.

Далёка не ўсе аб’екты спадчыны ўяўляюць цікавасць для інвестараў. Напрыклад, рэалізоўваць былыя і руйнаваныя цэрквы, касцёлы і сінагогі пад аграсядзібу дакладна не атрымаецца. Гэта выклікае адразу абурэнне грамадскасці. А у Віцебскай вобласці зараз тры царквы, тры касцёлы і адна сінагога знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і не выклікаюць вялікай зацікаўленасці з боку рэлігійных аб’яднанняў. Яшчэ тры руінаваныя культавыя будынкі знаходзяцца ва ўласнасці рэлігійных аб’яднанняў, але на іх аднаўленне пакуль не хапае сродкаў.

Акрамя помнікаў архітэктуры значная колькасць гістарычнай забудовы сканцэнтравана ў складзе гістарычных цэнтраў Віцебска і Полацка, якія з’яўляюцца асобнымі помнікамі горадабудаўніцтва. Пазітыўным вынікам працы з гэтымі аб’ектамі спадчына стала інвентарызацыя гістарычнага цэнтра г. Полацка, завершаная ў 2022 годзе, дзякуючы якой усе іншыя культурныя каштоўнасці, якія знаходзіліся на тэрыторыі гістарычнага цэнтра, сталі яго складовымі часткамі. Акрамя таго,

былі удакладнены назвы вуліц, нумарацыя будынкаў дапоўненая інвентарнымі нумарамі і літэрацыяй, што дазваляе дакладна вызначыць якая частка аб'екта нерухомасці лічыцца гістарычнай, а якая не адносіцца да гэтай катэгорыі. Таксама ў межах работы над гістарычным цэнтрам была дакладна пералічана гістарычная забудовы без катэгорыі (49 аб'ектаў), павышаны катэгорыі найбольш значных гісторыка-культурных каштоўнасцей, удакладнены склад асобных з іх.

На дадзены момант завяршаецца работа над складам гістарычнага цэнтра Віцебска (павінна быць звершана да канца 2025 года). Гэта дасць магчымасць дакладна вызначыць гістарычную забудову абласнога цэнтра і выключыць недакладнасці ў назвах, адрасацыі і складзе асобных аб'ектаў спадчыны. Акрамя таго, маюцца прапановы павышэння катэгорый асобных найбольш каштоўных аб'ектаў спадчыны і выдзяленне новых асобных гісторыка-культурных каштоўнасцей са складу існуючых.

Значную групу гісторыка-культурных каштоўнасцяў складаюць помнікі гісторыі, сярод якіх воінскія пахаванні дасягаюць 91 % (240 з 263). Віцебскі аблвыканкам і райвыканкамы вобласці неаднаразова ўздымалі пытанне пра неабходнасць пазбаўлення гэтай групы аб'ектаў двайнога ўліку культурных каштоўнасцей, тым больш, што большасць гэтых аб'ектаў не адпавядаюць крытэрыям, замацаваным у частцы першай артыкула 92 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Больш за тое, усе яны і так афіцыйна з'яўляюцца культурнымі каштоўнасцямі. Гэта пытанне неаднаразова ўздымалася ў навуковых публікацыях на старонках афіцыйных часопісаў і ў зборніках канферэнцый [гл. 2; 4].

Аналіз дзеючага Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей па Віцебскай вобласці па тыпалогіі асобных помнікаў гісторыі дазваляе казаць, што 98 з іх з'яўляюцца тыпавымі абеліскамі (стэламі, надмагільнымі помнікамі), якія не ўяўляюць вялікай мастацкай каштоўнасці. 12 гісторыка-культурных каштоўнасцей – гэта ўвогуле сучасныя гранітныя надмагільныя помнікі, усталяваныя на воінскіх пахаваннях. 81 помнік з'яўляюцца тыпавымі тыражаванымі скульптурамі (скульптурнымі кампазіцыямі). Яшчэ 3 творы манументальнага мастацтва можна кваліфікаваць як помнікі-бюсты. 38 помнікаў гісторыі з'яўляюцца, часцей за ўсё, рэдкімі аўтарскімі памятнымі знакамі, часам уключанымі ў складаны комплекс, і выдзяляюцца на фоне тыпавых твораў манументальнага мастацтва. Астатнія аб'екты можна класіфікаваць як мемарыяльныя комплексы.

Па выніку вывучэння 240 помнікаў гісторыі Віцебскай вобласці варта зрабіць выснову, што 223 з іх можна пазбаўляць статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей, пры ўмове захавання іх як культурных каштоўнасцей праз выкананне на месцах патрабаванняў дзеючага заканадаўства аб стварэнні і рэканструкцыі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Яшчэ 17, да якіх адносяцца выключна аўтарскія скульптуры і мемарыяльныя комплексы на месцы воінскіх пахаванняў, пакінуць у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Асобна варта закрануць пытанне аховы помнікаў археалогіі і археалагічных аб'ектаў. Згодна з дзеючым заканадаўствам помнікамі археалогіі лічацца археалагічныя аб'екты, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс, у сваю чаргу, археалагічным аб'ектам – матэрыяльныя нерухомыя аб'екты і комплексы разам з археалагічнымі артэфактамі, якія маюць гістарычнае, мастацкае, навуковае або іншае культурнае значэнне, якія ўтварыліся у выніку дзейнасці чалавека больш 120 год таму. На тэрыторыі вобласці зараз налічваецца 372 помніка археалогіі, а таксама тысячы выяўленых археалагічных аб'ектаў. Прычым штогод спецыялістамі знаходзяцца новыя археалагічныя аб'екты. Па колькасці зафіксаваных гарадзішчаў і курганных могільнікаў у Археалагічнай карце

Г.В. Штыхава Віцебская вобласць першая ў рэспубліцы, што падкрэслівае значнасць гэтага накірунка работы для рэгіёна.

Ахова археалагічнай спадчыны мае сваю спецыфіку з улікам таго, што часта гэтыя аб'екты размешчаны ў лясных масівах ці на сельскагаспадарчых землях і не заўсёды іх проста агледзець і лакалізаваць. Праводзіць пастаянны маніторынг таксама не проста. Напрыклад паміж Арлейскім гарадзішчам і гарадзішчам на воз. Невіда ў Полацкім раёне адлегласць 80 км. Узнікае пытанне як ажыццяўляць пастаянны кантроль за гэтымі аб'ектамі? Таму, на вялікі жаль, ажыццявіць пастаянны кантроль за помнікамі археалогіі на практыцы вельмі складана. Хаця, гэта надзвычай важна, асабліва ва ўмовах імклівага росту актыўнасці чорных капальнікаў.

Па сённяшні дзень адной з галоўных праблем з'яўляецца дакладная лакалізацыя помнікаў археалогіі. Дзякуючы удакладненню лакалізацыі за апошні час колькасць курганных могільнікаў у вобласці фармальна скарацілася, таму што адзін з іх фактычна аказаўся на тэрыторыі Мінскай вобласці, другі – у Пскоўскай вобласці РФ, яшчэ адзін адразу быў улічаны ў двух раёнах вобласці [гл. 3]. Справа ў тым, што большасць улічаных аб'ектаў, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс, лакалізаваліся археолагамі ў 1970-я і 1980-я гг. з улікам размяшчэння адносна існуючых тады населеных пунктаў без спецыяльнага абсталявання. Сучасныя тэхналогіі, у тым ліку выкарыстанне GPS-навігацыі, дае магчымасць вызначыць дакладныя каардынаты і межы аб'ектаў, удакладніць іх месца размяшчэння і вызначыць уласніка зямельнага участка, на якім яны размешчаны з дапамогай Публічнай кадастравай карты.

Сёння, калі паглядзець на кадастравую карту ў спецыяльную укладку "Тэрыторыі спецыяльнага рэжыму выкарыстання", можна ўбачыць, што многія помнікі археалогіі адзначаны на афіцыйным рэсурсе не у тым месцы, дзе фактычна знаходзяцца. Але каб рабіць такія высновы трэба спачатку ведаць іх дакладную лакалізацыю. Гэта выклікае неабходнасць поўнай інвентарызацыі правільнасці пазначэння аб'ектаў спадчыны на кадастравай карце, таму што гэта адна з форм забеспячэння захавання археалагічнай спадчыны пры правядзенні якіх-небудзь земляных работ ці пры выдзяленні зямельных участкаў.

З захаваннем помнікаў мастацтва ў Віцебскай вобласці праблемных пытанняў няма. Адзінае, на што варта звярнуць ўвагу гэта класіфікацыя асобных твораў мастацтва акурат як помнікаў мастацтва. На сённяшні дзень, напрыклад, незразумела чаму манументальная скульптура, прадстаўленая выдатным аўтарскім помнікам К.С. Заслонаву на станцыі Орша, зробленым вядомым беларускім скульптарам С. Селіханавым, быў аднесены да помнікаў гісторыі. Калі пахаванне К.С. Заслонава, размешчаная побач, можа быць аднесена да гэтай катэгорыі каштоўнасцяў, дык з самім творам мастацтва гэта, безумоўна, спрэчна.

Асобную групу гісторыка-культурных каштоўнасцей вобласці складаюць запаведныя мясціны, якіх усяго ў дзеючым Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей па рэспубліцы налічваецца чатыры, у абсалютнай большасці (3 з 4) гэта мясціны нараджэння і жыцця класікаў беларускай літаратуры. На Віцебшчыне да гэтай групы адносяцца: Мясціны жыцця і творчасці Янкі Купалы (Ляўкі) і Бярэзінская водная сістэма. Калі з першай з каштоўнасцей асаблівых праблем не існуе, апошняя наадварот патрабуе удакладнення шляхам канкрэтнага пераліку таго, што непасрэдна неабходна ахоўваць (канкрэтныя шлюзы, каналы, рэкі, пратокі і г.д.).

Таксама на тэрыторыі вобласці маецца 6 матэрыяльных рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей: манетны скарб у Лепельскім раённым краязнаўчым музеі, звон у Лёзненскай царкве, які быў знойдзены пры правядзенні земляных работ, а таксама прадметы з чатырох калекцый Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Сярод апошніх асабліва вылучаюцца асобныя

прадметы, якія маюць міжнародную значнасць і могуць у поўнай меры лічыцца нацыянальнымі рэліквіямі. Пры гэтым, варта звярнуць увагу на тое, што колькасць матэрыяльных рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей можа быць істотна пашырана за кошт іншых прадметаў музейнага фонду з калекцый музеяў вобласці.

Акрамя таго, на тэрыторыі Віцебскай вобласці на дадзены момант налічваецца 25 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. За кошт актыўнай дзейнасці ўстаноў клубнай сістэмы вобласці вядзецца планамерная работа па выяўленні, фіксацыі і папулярызацыі новых нематэрыяльных каштоўнасцей, колькасць якіх узрастае кожны год. Пры гэтым асаблівы акцэнт робіцца на захаванне ўжо існуючых традыцый, звычаяў, абрадаў, тэхналогій і г.д., бо ва ўмовах глабалізацыі і урбанізацыі колькасць іх патэнцыйных носьбітаў скарачаецца.

Такім чынам, Віцебшчына на сённяшні дзень валодае надзвычай багатай і разнастайнай гісторыка-культурнай спадчынай, якая мае ўсе падставы для пашырэння за кошт іншых культурных каштоўнасцей. Разам з тым, у захаванні асобных відаў аб'ектаў спадчына маюцца свае адметнасці і праблемныя пытанні, якія патрабуюць вырашэння як на агульнадзяржаўным узроўні (як, напрыклад, з воінскімі пахаваннямі), так і на месцах.


1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. – URL: http://gosspisok.gov.by (дата звароту: 15.09.2025)
2. Юрчак, Д. В. Асаблівасці дзяржаўнага ўліку помнікаў археалогіі ў Бешанковіцкім і Шумілінскім раёнах Віцебскай вобласці / Д. В. Юрчак // Віцебскі край : матэрыялы VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, 19 лістапада 2020 г., Віцебск / ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.Леніна", кафедра гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава ; рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2021. – Т. 6. – С. 245–250.
3. Юрчак, Д. В. Воінскія пахаванні як культурная каштоўнасць: да пытання неабходнасці іх двайнога ўліку / Д.В. Юрчак // Беларуская думка. – 2021. – № 1. – С. 83–89.
4. Юрчак, Д. В. Памятники и воинские захоронения: объекты историко-культурного наследия или мемориальные объекты? / Д. В. Юрчак // Победа – одна на всех : материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 24 апреля 2014 г. / Вит. гос. ун-т. ; редкол.: А. И. Жук и А. А. Коваленя (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2014. – С. 295–298.



**Желамский А.Г., Желамская М.А.**


## ИЗ ОПЫТА ИССЛЕДОВАНИЯ ПРИРОДНОГО И КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ РОССИЙСКО-БЕЛОРУССКОГО ПОРУБЕЖЬЯ


*Ключевые слова:* порубежье, легенды, Нещердо, Невельский идол, Отечественная война 1812 года, Я.П. Кульнев, Ян Барщевский, Почановская гора.


*Легенды Нещерды.* Порубежье России и Беларуси – край лесов и озёр, исчезающих в лесных чащах каменных дорог (камениц) и сцяжинок. Кажется, что нигде больше не бывает такого мерцания и свечения на поверхности вод, кроме этих местностей с их глухими и глубокими болотами, над которыми поднимаются холмы и леса.

Здесь, на русско-белорусском порубежье, чтят до сих пор праздник Купалы, день летнего солнцестояния, солнцеворота. Он отмечается 24 июня по старому стилю (в ночь с 6 на 7 июля по-новому), когда летнее солнце, достигнув полного проявления своих творческих сил, поворачивает на зиму

Исследователь поэтических воззрений славян на природу А.Н.Афанасьев писал: «по древне-поэтическим представлениям бог-громовник кипятит в грозовом пламени дождевую воду, купает в её ливнях небо и землю и тем самым дарует ей силу плодородия» [1, с. 41]. Купало – бог душевного и телесного очищения – в христианстве уступает место Иоанну Крестителю.

Народная память полна чудодейственных представлений о купальском празднике – об особой целительной силе трав и цветов, собранных в пору солнцеворота, об играющем на воде солнце, о переходящих с места на место деревьях, разговаривающих между собой шумом своих ветвей.